Надышла восень — работ восем. Магія лічбаў



Па гарызанталі: **1.** Лік, лічба, якая ў беларускіх легендах і паданнях сведчыць, што Бог стварыў свет за ... дзён; ад Масленкі да Вялікадня і ад яго да Тройцы таксама ... тыдняў. **7.** Прадмет, які складаецца з трох частак. **8.** Лік, які сімвалізуе ідэю сіметрыі; неба і зямля, дзень і ноч. (... салдаты — не войска, ... дубы — не дуброва (прык.). **9.** Лік, які ў многіх народаў свету лічыцца нешчаслівым; існуе павер'е, што ніколі не трэба садзіць за стол ... гасцей, бо нехта з іх абавязкова памрэ на працягу гэтага года. **12.** Люлі, люлі, дзіця, спаць — ... маці, бацькоў пяць (прык.). **13.** Лік, які адлюстроўвае ідэальна ўстойлівую структуру: ... бакі свету, ... пары года. («Рассыпся, гарох,\\На ... кучкі.\\А ў нашага гарманіста\\Залатыя ручкі» (прыпеўка). **14.** «У ... нядзелькі на Пакровах\\Прывезлі Яську ў лапцях новых;\\За ім два боты без абцасаў». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Дарэктар»). **17.** Галоўная артэрыя. 18. Лічба, якая, паводле павер'яў, адказвае за матэрыяльнае забеспячэнне сям'і, майстэрства і ўменне працаваць; тры гэтыя лічбы, паводле біблейскай легенды, азначаюць няўдачу, смерць; а ўбачыць у сне лічбу ... — быць падманутаму. **19.** Надышла восень — работ ... (прык.). **20.** Адмоўны электрод. **22.** Мастацкі вобраз, створаны драматургам. **23.** ..., або Сарачыны. Памінальны абрад, які адзначаецца на саракавы дзень пасля смерці чалавека. **26.** Ажурная вышыўка. **27.** Лік, які ляжыць у аснове вымярэння часу, таксама ў беларускім фальклоры згадваецца цмок з ... галавамі, а на Дзяды і калядную куццю гатавалі па ... страў. **28.** Мацунак, трываласць. **29.** Двухпудовая гіра. **30.** Гэты лік фігуруе ў многіх старадаўніх абрадах: маладых ... разы абводзілі вакол стала; на Дзяды гаспадар ... разы са свечкай абыходзіў стол перад вячэрай. (Адна ралля — два сярпы, дзве раллі — ... сярпы (прык.).

Па вертыкалі: **2.** Прадукты харчавання. **3.** Пасудзіна, у якую дояць малако. **4.** Той, хто абслугоўвае ліфт. **5.** Лепш адзін ..., чым дзесяць ворагаў (прык.). **6.** Абазначэнне ацэнкі ведаў і паводзін навучэнцаў. **10.** Верхні паўпаверх дома. **11.** Асоба тэхнічнага персаналу, якая кіруе групай рабочых на будаўніцтве. **15.** Пучок валасоў. **16.** Падман, хлусня (разм.). **19.** «Туманам слаўся ... -\\Шчадрэйшы грыбасей». З верша К. Цыбульскага «Сказ пра ката». **21.** Магічная лічба. Паводле павер'яў, струк гароху з ... гарошынамі мог спыніць вясельны поезд; пры першым купанні дзіцяці ў ночвы клалі ... вугольчыкаў з печы; вада, узятая з ... крыніцаў, мела асаблівую моц. **24.** Галоўныя палажэнні якой-небудзь навукі, тэорыі. **25.** Дзіцяня кошкі. **28.** Згода.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Сем. 7. Трайнік. 8. Два. 9. Трынаццаць. 12. Адна. 13. Чатыры. 14. Дзве. 17. Аорта. 18. Шасць. 19. Восем. 20. Кітай. 22. Рона. 23. Сарэкі. 26. Фіне. 27. Дванаццаць. 28. Мой. 29. Дваццаць. 30. Тры.

Па вертыкалі: 2. Ежа. 3. Дзбанка. 4. Ліфцёр. 5. Прыгадзень. 6. Адзінка. 10. Антрэсолі. 11. Дзяжурнік. 15. Пасма. 16. Аўтка. 19. Вераценьк. 21. Дзевяць. 24. Аснова. 25. Кацяня. 28. Мір.

Даты | Падзеі | Людзі — **11 кастрычніка**

1817 год — нарадзіўся (маёнтак Шчорсы, цяпер Навагрудскі раён) Антон Юзэф Глінскі, беларускі фалькларыст і пісьменнік. Працаваў у вядомай бібліятэцы Храптовічаў. З 1844 года жыў у Вільні, дзе рэдагаваў «Виленские губернские ведомости». З 1863 года быў перакладчыкам у газеце «Виленский вестник». Аўтар «Польскага казачніка» — зборніка апрацаваных беларускіх народных казак, показак, апавяданняў. Памёр у 1866 годзе.

1885 год — нарадзіўся Франсуа Марыяк, французскі пісьменнік. Раманы «Пацалунак, дараваны пракажонаму», «Тэрэза Дэскейру», «Маці» — гэтыя творы пісьменніка, філосафа і драматурга прынеслі яму першы літаратурны поспех. Але пазней Марыяк перажыў душэўны крызіс, выйсце з якога ён знайшоў у хрысціянстве і філасофіі Паскаля. З выхадам самага вядомага рамана Марыяка «Клубок змей» пісьменнік быў абраны членам Французскай акадэміі. Як драматург ён праславіўся п'есамі «Асмадэй» і «Нелюбімыя». Пасля працяглай паўзы ў творчасці ён напісаў свой апошні раман — «Падлетак былых часоў». У 1952 годзе «за глыбокае духоўнае прасвятленне і мастацкую сілу паказу драмы чалавечага жыцця» Марыяк быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй у галіне літаратуры.

1913 год — нарадзілася Эдзі Агняцвет, беларуская паэтэса. Аўтар шматлікіх зборнікаў лірыкі і твораў для юных чытачоў. Паводле яе лібрэта пастаўлены оперы для дзяцей «Джанат» Л. Шварца і «Марынка» Р.Пукста. Вядома Эдзі Агняцвет і як перакладчык на беларускую мову твораў замежнай паэзіі. У 1993 годзе выдадзены зборнік перакладаў «З французскай і бельгійскай паэзіі». Памерла ў 2000 годзе.

Было сказана

Генадзь ЦІТОВІЧ, музыказнавец, этнограф і харавы дырыжор:

«Песня здаўна збліжае, узаемаўзбагачае народы, асабліва калі яны жывуць у добрым суседстве».

НАРОДЖАНЫЯ 11 кастрычніка

Яны маюць багатую фантазію і жывое ўяўленне, любяць узбуджэнне, імкнуцца быць у цэнтры падзей і лічаць, што павінны адыгрываць важную і галоўную сацыяльную ролю. Аднак іх часта стрымлівае пачуццёвая прырода іх характару і цяга да задавальнення. Яны імкнуцца да грамадскай актыўнасці, таму што не могуць жыць ізалявана. Гэтыя людзі не любяць цяжкасці, яны не павінны дазваляць выкарыстоўваць сябе і маніпуліраваць сваімі паводзінамі асобам больш энергічным. Народжаныя ў гэты дзень любяць працаваць з іншымі, быць часткай каманды. Дзякуючы прыемнаму характару яны лёгка могуць пераходзіць з аднаго сацыяльнага або працоўнага асяродку ў іншы. Ім неабходна збіраць сілы для таго, каб разабрацца ў сабе і развіць сябе як асобу, не дасягнуўшы пры гэтым вышэйшай ступені самазадавальнення і самаўпэўненасці.

НАРОДЖАНЫЯ 12 кастрычніка

Гэта асобы, якія любяць знаходзіцца ў цэнтры падзей і ўвагі. Яны валодаюць добрымі навыкамі адносін з людзьмі, камунікабельныя, добра адчуваюць сябе ў розным асяродку. Яны валодаюць цудоўным талентам у адносінах з фінансамі, паважаюць традыцыі, экстравагантныя, надзеленыя пачуццём гумару і любяць празмернасць. Яны ўяўляюць сабой цудоўную сумесь дабрачынных і эгаістычных схільнасцяў. Дзякуючы сваёй кампетэнцыі і грамадскаму вопыту народжаныя ў гэты дзень могуць стаць добрай падтрымкай сваім сябрам, калегам, членам сям'і.

■ Простыя рэчы

КУКА

Бывае, блазнаватыя бацькі падбухторваюць сваё маленькае, няўцямнае, якое і гаварыць яшчэ добра не навучылася, дзіцятка:

— Ну, пакажы дзядзьку куку, падторкні пад нос...

І хлапчанё, чыстае, як неба, ад грахоў, апроч першароднага, няўклюдна сціскае ў кулачок танюткія пальчыкі. Для фічкі яны яшчэ неслухмяныя — не складзеш у мудроную фігуру, а кука ўжо атрымліваецца.

А яго бацькі, якія, відаць, не дагулялі ў дзяцінстве, як цацку выкарыстоўваюць маленькага чалавека: знайшлі пацеху, рагочуць, задаволеныя не абыякім, на іх думку, розумам і спрытам свайго нашчадка. Збянтэжаны дзядзька не ведае, што рабіць: ці то хваліць дзіця за сумнеўнае «ўмельства», ці то вымаўляць тату з мамай за бязглуздае выхаванне... Крывіцца ў кіслай усмешцы ды пераводзіць гаворку на што-небудзь прыемнае. Вядома, калі сам не аматар сумнеўных пацех.

Але я не пра гэтую недарэчную куку, я — пра земляробчую прыладу. Пра старадаўнюю, якую патрымаў у руках у сваім дзяцінстве ды юнацтве. І такімі далёкімі яны мне цяпер здаюцца, усё адно як прамігнулі ў якім сярэднявеччы.

Кука адышла ў нябыт. «Можа, і тлумачальны слоўнік пра яе не згадвае?» — падумалася мне. Ну як жа, вось, чытайце: «Вялікі драўляны малаток рознай формы і рознага прызначэння». А ніжэй — паэтычнае сведчанне: «Паляжаў у калысцы, у пялёнках, а падрос — і работу знайшлі: за каровамі бег наўздагон, кукай груды крышыў на раллі...», — пісаў Уладзімір Дубоўка.

«Рознага прызначэння...» Але я следам за слынным паэтам згадваю куку менавіта для разбівання глыжоў на раллі. Яна была незаменнай на цяжкіх сугліністых агародах.

Узарэ гаспадар зямельку, а тут дождж раптоўны як з вядра хлыне, а назаўтра — сонца прыгрэўнае ды ветрык сухавейны, — вось і забугрылася зямля камяністымі глыжамі. А як іх раскрышыць на мак, каб зярняты высяваліся не на камяні, а ў пульхную глебу? Як даць рады глыжам, калі ў гаспадарцы для разрыхлення зямлі — толькі невялікая барана, ды і тая не цалкам з жалеза, на драўляным рыштаванні? Культыватар — толькі ў калгасе, штодня заняты на шырокіх гонях. Вось тады і браліся за куку.

А гэтая кука з кароценькім дзяржальнам, відаць, зроблена былым вяскоўцам для дачных сотак. Не «груды крышыць на раллі», а так, паразбіваць якія глыжочкі, згадваючы вялікі бацькоўскі агарод.

З матэрыялізаванай гісторыі беларускага вясковага побыту куку, здаецца, выкінулі беззваротна: не прыгадваю выпадку, каб бачыў яе сярод экспанатаў якога краязнаўчага ці этнаграфічнага музея.

А «малаточак» — важкі цурбачок, старанна абчасаны і падгабляваны, у выглядзе вялікага — не крамнага, а як даўней самі пяклі — бохана хлеба. Асаджвалі гэты цурбачок на доўгім, амаль у поўны рост земляроба, дзяржальні. Узнімеш куку над галавой пад неба, грак з усяе сілачкі — камень-глыж разбіваецца, як порхаўка. Вось у такую глебу можна ўжо сеяць, хіба што папярэдне яшчэ раз пабаранаваўшы.

Пры вырабе кукі (а ў ёй не мелі патрэбы толькі ўладальнікі гародаў з глебай, сыпкай, як пясочак) не прытрымліваліся якога-небудзь стандарту. Усё залежала ад росту і дужасці рук гаспадара і яго гаспадыні. Нізкаватыя рабілі карацейшае дзяржальна, слабейшыя насаджвалі на яго лягчэйшы цурбачок.

Кука, можна сказаць, паядноўвала ды зроўнівала мужа з жонкай. Каб памахаць ёю дзянёк, патрэбны не абыякая сіла і цягавітасць, а з другога боку — уважлівасць, засяроджанасць, каб не прапусціць ніводны глыж, вытрымка і цярпенне, як, напрыклад, пры... вышываванні. Дык глыжы білі і муж, і жонка, і нават трохі ўзмужнелыя сыны-падлеткі.

У нашай сям'і быў вялікі агарод з цяжкой гліністай глебай, якую вяскоўцы называлі «бягелдай» (можа, таму і большы, чым іншым, кавалак адрэзалі). Так што куку даводзілася трымаць пад рукой. «Папіцавалі» з ёю і бацька, і маці, і, калі ўзрос, — трошкі я.

...Прыехаўшы нядаўна на родную сялібу, агледзеў усе завуголлі і не знайшоў куку. Відаць, у свой час спалілі яе як адрынутую часам непатрэбшчыну. Куцы наканавана завяршэнне свайго існавання менавіта ў агні. Бо хто ж выкіне на сметнік такі спрытны, сухі, як порах, цурбачок?

А вось з матэрыялізаванай гісторыі беларускага вясковага побыту куку, здаецца, выкінулі беззваротна: не прыгадваю выпадку, каб бачыў яе сярод экспанатаў якога краязнаўчага ці этнаграфічнага музея. За нявартую ўвагі дробязь яе палічылі, ці што?.. А можа, проста не ўзіраўся.

Яно і праўда: кука — усяго толькі някідкі штрышок у графічным малюнку побыту нашых вяскоўцаў у мінулым стагоддзі. «Дык чаму тады гэты дзядзька-аўтар пляце і пляце нам пра даўно апалае і струхлелае вецце дуба? — падумае які-небудзь малады чалавек. — Хоць ты куку яму пад нос падторкні...»

А таму, даражэнькія, што старадаўняя драўляная прылада дапамагла мне на ўсё жыццё зберагчы ў памяці вобраз матулі.

Уваччу яе сілуэт на змярканні сонца: ражкі хусткі тырчаць у розныя бакі, спрытна сядзіць на плячах лёгкая паддзёвачка, у руках — кука, якая зноў і зноў, нібы разняволены ківач, узнімаецца над зямлёю... Іншым разам маці робіць колькі крокаў назад, калі заўважае ацалелы глыж. Але рукі яе ўжо дужа натомленыя, і кука з глухім вухканнем падае на зямлю трошкі наўзбоч таго глыжа. Маці цяжка ўздыхае, і яе ўздых прыкра дапасоўваецца да таго вухкання... А я, маленькі, тонкі, як пруток, стаю побач, на мяжы, і нічым не магу дапамагчы.

Столькі гадоў прайшло, а памяць пра той веснавы надвячорак гарачым вугельчыкам апякае маю душу. Памяць і толькі аднойчы ў жыцці зазнаная крыўда на сялянскі лёс.

Сяргей РУБЛЕЎСКІ

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Мясны пірог «Хрызантэма»

Спатрэбіцца: *мясны фарш — 500 г, цыбуля — 1 шт., часнок — 1 зубчык, вада — 100 мл, сыр цвёрды — 150 г, масла — 30 г, соль, чырвоны і чорны перац — на смак. Для цеста: малако — 125 мл, кефір — 125 мл, дрожджы сухія — 1 пакуначак (7 г), цукар — 1 ст.л., соль — 1 ч.л., яйка — 1 шт., мука — 500 г, алей — 6 ст.л.*

У цёплым малацэ распусціць дрожджы, дадаць цукар і адставіць убок на 15—20 хвілін, каб дрожджы «ажылі». Змяшаць кефір, цукар, соль, яйка, алей, дадаць разведзеныя дрожджы, прасеяную муку і замясіць мяккае цеста. Накрыць міску з цестам плёнкай і паставіць у цёплае месца прыкладна на 1 гадзіну. Затым цеста абмяць і падзяліць на дзве роўныя часткі. Адну частку прыбраць зноў у міску і накрыць ручніком. Другую частку цеста раскачаць у пласт таўшчынёй 3-4 мм (стол падпыліць мукой пры неабходнасці). Выціснуць з цеста шклянкай кругі (дыяметрам 7-8 см). Рэшткі цеста сабраць, абмяць, зноў раскачаць і выціснуць кругі. Нарыхтоўкі прыкрыць плёнкай, каб не абсыхалі.

Для начынкі ў фарш дадаць здробненую цыбулю, часнок, соль, перац і ваду і ўсё добра перамяшаць. Сыр надзерці на буйной тарцы. На крузе цеста размеркаваць раўнамерна 1 ч. л. фаршу (поўную), дробку сыру. Скласці яго напалову. Затым яшчэ раз напалову. Кончыкі знізу злёгку прышчыпнуць. Форму (дыяметрам 28 см) спачатку памазаць алеем, затым на дно пакласці паперу для выпечкі і яе таксама прамазаць алеем (так можна будзе лёгка дастаць пірог з формы). Выкласці кругі шчыльна адзін за адным у форму. Калі ўсе кругі выкарыстаеце, перайсці да другой часткі цеста і паўтарыце ўсё гэтак жа. Складзіце палавінкі ўнахлёст. Скруціце рулончыкам, пачынаючы з ніжняй і выкладзіце ў сярэдзіну пірага. Запоўненую форму трэба прыкрыць плёнкай і пачакаць прыкладна 20-30 хвілін. Змазваем верх пірага злёгку ўзбітай сумессю: 1 жаўток + 1 ст. л. малака.

Выпякаць пірог у духоўцы пры 180°С прыкладна 35-40 хвілін. Гатовы пірог змазаць растопленым маслам (30 г) і накрыць ручніком хвілін на 15.

РУПЛІВЫ ГАСПАДАР

Як прыбраць камячкі з адзення?

Большасць людзей лічыць, што камячкі на вопратцы ўзнікаюць «дзякуючы» машыннаму пранню, няякаснаму матэрыялу адзення або няправільнай носцы. Збольшага гэта праўда. Аднак, калі вы будзеце купляць вопратку ў дарагіх буціках і працаваць яе толькі ўручную, камячкі рана ці позна ўсё роўна з'явяцца. Каб выдаліць камячкі з адзення, некаторыя выкарыстоўваюць станок для галення, некаторыя — зубную шчотку. А ёсць і тыя, якія робяць гэта з дапамогай спецыяльных машынак, прызначаных для выдалення камячкоў з адзення.

Давайце разбярэмся, які з метадаў найбольш эфектыўны.

Станок для галення ў дапамогу

Для гэтага падыдуць толькі старыя брытвы савецкага тыпу. Вельмі важна, каб яны былі злёгку тупаватыя, каб выпадкова не выдаліць лішняе ці, што яшчэ горш, не застацца без кавалачка пальца. Пасля выканання ўсіх мер бяспекі акуратна нацягніце саму рэч, каб тканіна не правісала, і зразайце камячкі брытвай, паступова, акуратна, нікуды не спяшаючыся, бо адзін няправільны рух — і рэч будзе назаўжды сапсавана. Працэс, вядома, працаёмкі і доўгі, але досыць эфектыўны.

Зубная шчотка — эфектыўны саюзнік

А як ачысціць рэч з ангорскай воўны або махеру? Карыстацца станком для галення ў гэтым выпадку не рэкамендуецца. Замест яго варта выкарыстоўваць мяккую зубную шчотку. Для таго каб пазбавіцца ад камячкоў на вопратцы гэтым спосабам, шчотку пры чыстцы неабходна накіроўваць уздоўж валокнаў. Калі вы будзеце начэсваць світар ці кофту наадварот, то выраб будзе сапсаваны. Як толькі вы прыбераце камячкі з махеру, замачыце рэч на паўгадзіны ў цёплай вадзе з даданнем воцату. Пасля гэтай працэдуры, калі рэч стане пушыстай, абавязкова прасушыце яе, паклаўшы на сухі ручнік удалечыні ад прамых сонечных промняў або абагравальнікаў. На жаль, выдаленне камячкоў на вопратцы такім спосабам давядзецца паўтараць вельмі часта.

І яшчэ некалькі эфектыўных спосабаў

Калі вы не жадаеце марнаваць час, каб пазбавіцца ад камячкоў уручную, тады набудзьце для гэтых мэт спецыяльную машынку. Працуе яна на батарэйках, зможа ачысціць не толькі адзенне, але і мэблю, дываны, плюшавыя цацкі.

Можаце паспрабаваць прыбраць камячкі з дапамогай дробнай наждачнай паперы. Наколькі гэта эфектыўна, мяркуйце самі. Але на самой справе гэты спосаб не вельмі распаўсюджаны.

Таксама існуе спосаб, які прадугледжвае выдаленне камячкоў з дапамогай скотча. Тут усё вельмі проста: прыляпляюць паласу скотча на рэч, а затым рэзка яе адрываюць.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 8 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.30	18.22	10.52
Віцебск	7.21	18.10	10.49
Магілёў	7.20	18.12	10.52
Гомель	7.14	18.11	10.57
Гродна	7.44	18.38	10.54
Брэст	7.43	18.40	10.57

Імяніны

Пр. *Марыі, Ульяны, Аляксея, Анатоля, Мікалая, Рыгора, Фёдара.*
К. *Альдоны, Аляксандра, Вальдэмара, Эміля.*

Фота Алеся ВАРАБЁЎАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +16..+18°С	КІЕЎ +17..+19°С	РЫГА +12..+14°С
ВІЛЬНЮС +18..+20°С	МАСКВА +13..+15°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +9..+11°С

УСМІХНЕМСЯ

Паважаныя вытворцы мікрахвалевых печак, зрабіце так, каб можна было адключаць сігнал у канцы цыкла. Ноччу людзей, якія сядзяць на дыеце, гэта вельмі кампраметуе.

Мужчына заходзіць у краму, якая гандлюе зброяй, і кажа прадаўцу:

— Вось хачу вярнуць гэты рэвальвер, які ўчора ў вас купіла мая жонка.

— А ў чым справа? Ён не працуе?

— Не, усё нармальна, ён выдатна працуе, проста мы ўжо паміраліся.

— Так, вы хто?

— Напалеон.

— Гэтага ў палату да Сталіна, Мусаліні і іншых.

— Але я торцік...

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by, (для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.179. Індэкс 63850. Зак. № 4168.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2014 года.